# *§ 24–0. Расія ў 1917 г.: Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі

РЭВАЛЮЦЫЯ КРЫЗІС СТАЧКА
ПРАЛЕТАРЫЯТ БУРЖУАЗІЯ
АПАЗІЦЫЯ МАНАРХІЯ ЭСЭРЫ
ЧАСОВЫ ЎРАД
ПЕТРАСАВЕТ МЕНШАВІКІ КАДЭТЫ
БАЛЬШАВІКІ АКЦЯБРЫСТЫ
ДВОЕЎЛАДДЗЕ САМАДЗЯРЖАЎЕ

Эканамічны крызіс

**1. Падзенне манархіі.** Першая сусветная вайна спрыяла нарастанню крызісных з'яў у жыцці расійскага грамадства і дзяржавы. Эканоміка аказалася нездольная поўнай мерай забяспечыць патрэбы як 10-мільённай арміі, так і тылу. Транспарт не спраўляўся з перавозкамі. Напачатку 1917 г. пачаліся рэгулярныя перабоі ў забеспячэнні буйны́х гарадоў неабходнымі таварамі, у тым ліку і хлебам. Рэзкую незадаволенасць выклікаў рост цэн на тавары першай неабходнасці.

Палітычны крызіс

Улада не магла вырашыць праблемы, што ўвесь час нарасталі. Аўтарытэт урада і асабіста імператара Мікалая II не рос ад няўдач на франтах. Значныя расійскія тэрыторыі былі акупаваныя Германіяй. Незадаволенасць насельніцтва вылілася ў шматлікія стачкі. Бальшавікі вялі актыўную агітацыю супраць вайны, заклікалі ператварыць вайну імперыялістычную ў вайну грамадзянскую з мэтай здабычы ўлады пралетарыятам. Ва ўмовах нарастання крызісных з'яў і нястдольнасці ўрада справіцца з імі прэтэнзіі на больш актыўны ўдзел у кіраванні дзяржавай пачала выстаўляць буржуазія.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ



*Рычард Пайпс*

Як адзначае даследчык рускай гісторыі Р. Пайпс, да канца 1916 г. усе палітычныя партыі аб'ядналіся ў апазіцыю да манархіі. Зрэшты, гэта было іх адзіным пунктам судакранання — ні ў чым іншым яны не сыходзіліся. Крайніх левых не задавальняла штосьці меншае, чым радыкальнае пераўтварэнне палітычнага, сацыяльнага і эканамічнага ўладкавання Расіі. Лібералы былі б задаволеныя парламенцкай дэмакратыяй. І тыя і іншыя, пры ўсіх іх адрозненнях, вялі гаворку пра інстытуты ўлады. Крайнія правыя, якія цяпер таксама далучыліся да апазіцыі, наадварот, засяродзілі ўвагу на асобах палітычных дзеячаў. На іх думку, у расійскім крызісе вінаваты быў не сам рэжым, а людзі, якія стаялі на чале ўлады. І варта прыбраць іх з палітычнай арэны, лічылі яны, як усё пойдзе добра.

1. *Чаму, на думку вучонага Р. Пайпса, усе палітычныя партыі Расіі напрыканцы 1916 г. выступалі супраць манархіі?*
2. *Як вы лічыце, ці сведчыла такая палітычная абстаноўка пра рэвалюцыйную сітуацыю?*
3. *Паразважайце, наколькі Лютаўская рэвалюцыя ў Расіі была непазбежная. Што мусіў зрабіць Мікалай II, каб захаваць уладу?*

Думская манархія, што існавала на той час у Расіі, не давала ёй такой магчымасці. Апазіцыя, якая сфарміравалася ў Дзяржаўнай думе, патрабавала ад Мікалая II рэформаў, ды цар адмаўляўся ісці на саступкі.

### Пачатак Лютаўскай рэвалюцыі

Для ходу рэвалюцыі вырашальнае значэнне мелі падзеі ў Петраградзе. У сталіцы сістэматычнымі зрабіліся перабоі з харчаваннем і палівам. Праз адсутнасць паліва 18 лютага спыніўся Пуцілаўскі, а пасля і іншыя заводы. Дзясяткі тысяч рабочых засталіся без сродкаў да існавання. Гэта, разам з нястачай хлеба, выклікала масавыя выступленні ў Петраградзе, якія пачаліся 23 лютага. У Расіі выбухнала Лютаўская рэвалюцыя.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**З данясення генерала С. С. Хабалава Мікалаю II**

Прашу далажыць Яго Імператарскай Вялікасці, што выканаць наказ аб аднаўленні парадку ў сталіцы не мог. Большасць часцей, адны за аднымі, здрадзілі свайму абавязку, адмовіліся змагацца супраць мяцежнікаў. Іншыя часці пабраталіся з мяцежнікамі і абярнулі сваю зброю супраць верных Яго Вялікасці войскаў. Тыя, хто засталіся верныя абавязку, увесь дзень змагаліся супраць мяцежнікаў, нясучы вялікія страты. Да вечара мяцежнікі авалодалі большай часткай сталіцы. Верныя прысязе застаюцца невялікія часці розных палкоў, сцягнутыя каля Зімовага палаца, з якімі буду працягваць барацьбу.

*1. Як вы лічыце, чаму большасць салдат падтрымалі рэвалюцыю?*
*2. Ці можна сказаць, што вынік паўстання ў Петраградзе вырашыў пераход на бок народа салдат мясцовага гарнізона?*

### Стварэнне Часовага ўрада і Петрасавета

27 лютага дэпутаты Дзяржаўнай думы, якія не падпарадкаваліся царскаму ўказу аб яе роспуску, стварылі Часовы камітэт Дзяржаўнай думы, рэарганізаваны ў ноч на 2 сакавіка ў Часовы ўрад. У тыя ж дні ў сталіцы быў створаны Петраградскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў (Петрасавет). Часовы ўрад складаўся з прадстаўнікоў партый акцябрыстаў і кадэтаў. У Петрасавеце пераважалі меншавікі і эсэры.

### Адрачэнне Мікалая II ад трона

Мікалай II разлічваў вярнуць кантроль над Петраградам пры дапамозе арміі. Аднак падтрымаць цара адмовіліся не толькі салдацкія масы, але і генералітэт арміі. Апынуўшыся ў ізаляцыі, 2 сакавіка 1917 г. Мікалай II адрокся ад трона на карысць свайго брата Міхаіла. Той заявіў, што лёс манархіі ў Расіі павінен вырашыць Устаноўчы сход.

Самадзяржаўе ў Расіі пала. Гэта было найважнейшай заваёвай Лютаўскай рэвалюцыі. У краіне ўсталяваліся шырокія дэмакратычныя свабоды. Рухаючымі сіламі Лютаўскай рэвалюцыі выступілі рабочы клас, сялянства, салдаты, значная частка буржуазіі. У яе рукі перайшла дзяржаўная ўлада.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**З ліста вялікага князя Андрэя Уладзіміравіча Раманава**

Сёння як гром нас абдала навіна пра адрачэнне Гасудара за сябе і Аляксея ад трона на карысць Міхаіла Аляксандравіча. Другое адрачэнне вялікага князя Міхаіла Аляксандравіча ад трона яшчэ болей жахлівае. Пісаць гэтыя радкі, перажываючы такія цяжкія моманты, надта цяжка і складана. У адзін дзень уся мінулая веліч Расіі абрынулася. І абрынулася беззваротна, але куды мы пойдзем. Заклік Міхаіла Аляксандравіча да ўсеагульных выбараў самы жахлівы. Што можа быць створана, ды яшчэ ў такі час.

*1. Як вы лічыце, чаму навіна пра адрачэнне Мікалая II ад трона так засмуціла Андрэя Уладзіміравіча? Чаму вялікі князь так баіцца ўсеагульных выбараў?*

*2. Паразважайце, якія шляхі палітычнага развіцця Расіі адкрывала Лютаўская рэвалюцыя.*

**Фарміраванне двоеўладдзя**

**2. Двоеўладдзе і яго сутнасць.** Пасля падзення самадзяржаўя ўлада перайшла да Часовага ўрада. Петрасавет фактычна перадаў уладу Часоваму ўраду, але пакінуў за сабой права кантролю яго дзейнасці і права выдаваць уласныя распараджэнні. Для вырашэння пытання наконт будучага дзяржаўнага ўладкавання Расіі меркавалася скліканне Устаноўчага сходу. Такім чынам, у Петраградзе склалася двоеўладдзе ў выглядзе Часовага ўрада і Петрасавета. Яно аформілася і ў правінцыі. Органамі ўлады Часовага ўрада на месцах зрабіліся губернскія і павятовыя камісары. Адначасова па ўсёй краіне былі створаны Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў і Саветы сялянскіх дэпутатаў. У чэрвені

**I Усерасійскі з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў**

прайшоў I Усерасійскі з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Ён выказаў давер Часоваму ўраду і падтрымаў яго курс на працяг вайны да дасягнення перамогі.

**Завяршэнне перыяду двоеўладдзя**

Напачатку ліпеня Часовы ўрад сутыкнуўся з крызісам. Міністры-кадэты, у тым ліку і кіраўнік урада Г. Львоў, падалі ў адстаўку. Скарыстаўшыся



*І Усерасійскі з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў*



*А. Ф. Керанскі*

сітуацыяй, бальшавікі арганізавалі ў Петраградзе маніфестацыі пад лозунгам «Уся ўлада Саветам!». Часовы ўрад пры падтрымцы Петрасавета гэтыя выступленні задушыў. Перыяд двоеўладдзя скончыўся, бо Саветы перайшлі на пазіцыю поўнай падтрымкі Часовага ўрада. Новы Часовы ўрад, у які ўвайшлі восем кадэтаў і блізкіх да гэтай партыі палітыкаў і сем міністраў, якія прадстаўлялі ўмераныя сацыялістычныя партыі эсэраў і меншавікоў, узначаліў эсэр А. Керанскі.

**3. Кастрычніцкая рэвалюцыя і яе характар.** Пасля ліпеньскіх падзей у Петраградзе Расійская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя (бальшавікоў) (РСДРП(б)) на чале з У. І. Леніным узяла курс на захоп улады шляхам узброенага паўстання. Росту папулярнасці бальшавікоў паспрыяла няўдалая палітыка Часовага ўрада. Ён не рабіў ніякіх захадаў для вырашэння найбольш злабадзённых для расійскага грамадства пытанняў. Народныя масы патрабавалі міру, а ўрад выставіў лозунг вайны да пераможнага канца. Да склікання Устаноўчага сходу адкладалася вырашэнне аграрнага пытання. Не быў уведзены 8-гадзінны рабочы дзень. Ва ўмовах рэвалюцыі абвастрылася нацыянальнае пытанне. Вынікам такой сітуацыі было

**Перадумовы Кастрычніцкай рэвалюцыі**

рэзкае падзенне папулярнасці Часовага ўрада, аслабленне яго ўлады.

### Карнілаўскі мяцеж

Спробу шляхам усталявання ваеннай дыктатуры прадухіліць скатванне Расіі да безуладдзя здзейсніў галоўнакамандуючы рускай арміі генерал Л. Г. Карнілаў. Напрыканцы жніўня ён рушыў верныя яму войскі з фронту на Петраград. А. Керанскі аб’явіў Л. Карнілава мяцежнікам. Галоўную ролю ў ліквідацыі выступлення Карнілава адыгралі бальшавікі. Яны пачалі стварэнне рабочай Чырвонай гвардыі. Войскі Л. Г. Карнілава былі спыненыя і раззброеныя практычна без ніводнага стрэлу, а сам ён арыштаваны. Пасля задушэння выступлення Л. Г. Карнілава Часовы ўрад 1 верасня 1917 г. абвясціў Расію рэспублікай.

Актыўны ўдзел бальшавікоў у барацьбе з карнілаўскім мяцяжом павысіў іх папулярнасць. Яны здабылі большасць у Петраградскім і Маскоўскім саветах. А Часовы ўрад усё больш траціў магчымасць уплываць на сітуацыю ў краіне. Нарастаў эканамічны крызіс, буйны́я гарады сутыкнуліся з пагрозай голаду. Рос стачачны рух. Складаная была сітуацыя на фронце.



*Лаўр Георгіевіч Карнілаў*

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

Сваю спробу мяцяжу Л. Г. Карнілаў апраўдваў наступным чынам: «Я, генерал Карнілаў, сын казака-селяніна, заяўляю ўсім і кожнаму, што мне асабіста нічога не трэба, апроч захавання Вялікай Расіі, і клянуся давесці народ шляхам перамогі над ворагам да Устаноўчага сходу, на якім ён сам вырашыць свае лёсы і абярэ лад свайго новага дзяржаўнага жыцця».

1. *Растлумачце, чым кіраваўся Л. Г. Карнілаў, выступаючы супраць Часовага ўрада.*
2. *Як вы лічыце, чаму ў Расіі была так папулярная ідэя правядзення Устаноўчага сходу?*

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

«Улада без сілы і сіла без улады», — так вызначыў палітычную сітуацыю ў Расіі напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі першы старшыня Часовага ўрада Г. Я. Львоў.

*1. Растлумачце, чаму гэтаму перыяду была дадзена такая характарыстыка.*

*2. Які орган улады быў «уладай без сілы», а якая палітычная арганізацыя — «сілай без улады»?*



*Георгій Яўгенавіч Львоў*

### Паўстанне ў Петраградзе

У. І. Ленін прыйшоў да вываду, што для бальшавікоў склалася ўнікальная сітуацыя, каб захапіць уладу. 24 кастрычніка (6 лістапада) 1917 г. пад кіраўніцтвам Петраградскага Савета пачалося ўзброенае паўстанне ў сталіцы. У ім актыўны ўдзел узялі салдаты гарнізона, маракі Балтыйскага флоту, рабочая Чырвоная гвардыя, якія 25 кастрычніка (7 лістапада) практычна без супраціву ўсталявалі кантроль над Петраградам. У ноч на 26 кастрычніка (8 лістапада) Часовы ўрад быў арыштаваны.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Бронепалубны крэйсер «Аўрора» быў пабудаваны ў 1900 г. Браў удзел у руска-японскай і Першай сусветнай войнах. З'яўляецца адным з галоўных сімвалаў Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Ад 1948 г. знаходзіцца на вечнай стаянцы каля Петраградскай набярэжнай ля вытоку Вялікай Неўкі. Выкарыстоўваецца як карабель-музей.



*1. Пры дапамозе дадатковых крыніц інфармацыі растлумачце, чаму гэты карабель з'яўляецца адным з сімвалаў Кастрычніцкай рэвалюцыі.*

*2. Якую ролю ён адыграў у рэвалюцыйных падзеях?*

**II Усерасійскі з’езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў**

Увечары 25 кастрычніка пачаў работу II Усерасійскі з’езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Большасць на ім складалі бальшавікі і іх саюзнікі — левыя эсэры. З’езд аб’явіў пра пераход улады ў рукі Саветаў, сфарміраваў савецкі ўрад — Савет Народных Камісараў (СНК) — на чале з У. Леніным. Дэлегаты прынялі першыя дэкрэты савецкай улады. Дэкрэт аб міры прадугледжваў заключэнне ўсімі дзяржавамі, якія ваявалі, міру без анексій і кантрыбуцый. Дэкрэт аб зямлі — бязвыплатную перадачу памешчыцкай зямлі сялянам.

**Выбары ва Устаноўчы сход**

Пасля таго як бальшавікі прыйшлі да ўлады, адбыліся выбары ва Устаноўчы сход. Найбольшую колькасць галасоў атрымалі эсэры (40,4 %). За бальшавікоў прагаласавала 24 % выбаршчыкаў. Няўдалымі былі выбары для ліберальных партый, якія набралі толькі 7,5 % галасоў. Устаноўчы сход пачаў сваю працу 5 (18) студзеня 1918 г. Калі сход адмовіўся прызнаць рашэнні II З’езда Саветаў, бальшавікі разагналі яго ўзброенай сілай. У вyні-

Уважліва разгледзьце палітычных дзеячаў, якія ўвайшлі ў склад І Савета Народных Камісараў.




Якія пасады яны займалі? Хто з іх удзельнічаў у стварэнні СССР?

ку ўлада цалкам засяродзілася ў руках бальшавікоў, саюзнікамі якіх да лета 1918 г. выступалі левыя эсэры.

**Абвяшчэнне РСФСР**

10 (23) студзеня 1918 г. адкрыўся III Усерасійскі з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў, які фактычна ўзяў на сябе паўнамоцтвы Устаноўчага сходу. Да яго далучыліся дэлегаты III Усерасійскага з'езда Саветаў сялянскіх дэпутатаў. Ён абвясціў Расію Савецкай Федэратыўнай Сацыялістычнай Рэспублікай (РСФСР). У ліпені 1918 г. была прынятая канстытуцыя, якая ўзаконіла ўсталяванне ў Расіі савецкай улады.

**Характар Кастрычніцкай рэвалюцыі**

Кастрычніцкая рэвалюцыя была сацыялістычная паводле свайго характару. Бальшавікі ажыццявілі яе, абапіраючыся на падтрымку асноўнай масы рабочых і сялян, у тым ліку і апранутых ва ўмовах вайны ў салдацкія шынялі.

**Значэнне Лютаўскай рэвалюцыі**

**4. Значэнне і наступствы Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый.** Лютаўская рэвалюцыя прывяла да звяржэння самадзяржаўя і прыходу да ўлады ліберальных палітычных сіл. Актыўны ўдзел у гэтых падзеях народных мас і стварэнне імі органаў улады ў выглядзе Саветаў, няздольнасць Часовага ўрада вырашыць надзённыя для краіны задачы прывялі да таго, што рэвалюцыя не спынілася на буржуазна-дэмакратычным этапе.

**Значэнне Кастрычніцкай рэвалюцыі**

Кастрычніцкая рэвалюцыя прывяла да ўсталявання ўлады бальшавікоў. У выніку быў адкінуты буржуазна-дэмакратычны варыянт развіцця Расіі і абраны шлях будаўніцтва сацыялістычнага грамадства. Тым самым Кастрычніцкая рэвалюцыя абумовіла правядзенне пераўтварэнняў, якія карэнным чынам змянілі дзяржаўны лад Расіі і ўвесь уклад жыцця людзей. Савецкая форма дзяржавы ў спалучэнні з эканомікай, заснаванай на пнаванні дзяржаўнай уласнасці, — гэта была нябачаная раней у сусветнай гісторыі мадэль грамадскага развіцця.

*Першая сусветная вайна зрабілася пераломным перыядам у расійскай гісторыі. Эканамічны і палітычны крызіс, выкліканы вайной, прывёў да звяржэння самадзяржаўя ў выніку Лютаўскай рэвалюцыі і пераходу ўлады да Часовага ўрада. Няздольнасць Часовага ўрада вырашыць надзённыя для краіны задачы прывяла да Кастрычніцкай рэвалюцыі і ўсталявання савецкай улады, якая паспяхова пачала сацыялістычныя пераўтварэнні ў грамадстве і дзяржаве.*

**калі ў свеце…**

Студзень 1918 г. — праца Устаноўчага сходу ў Расіі

**на тэрыторыі Беларусі…**

Снежань 1917 г. — I Усебеларускі з'езд

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Назавіце прычыны Лютаўскай рэвалюцыі. Ці можна сцвярджаць, што напачатку 1917 г. у Расіі склалася рэвалюцыйная сітуацыя?
2. Якія найбольш важныя нявырашаныя пытанні стаялі перад Расіяй вясной — восенню 1917 г.? Параўнайце пазіцыю наконт гэтых пытанняў Часовага ўрада і бальшавікоў.
3. Як вы лічыце, чаму бальшавікі здолелі ажыццявіць Кастрычніцкую рэвалюцыю? Якія пераўтварэнні ажыццявілі бальшавікі, прыйшоўшы да ўлады? Чаму гэтыя падзеі розныя людзі апісваюць і ацэньваюць зусім па-рознаму?
4. Як была арганізаваная сістэма дзяржаўнага кіравання ў Савецкай Расіі? Прадстаўце яе ў выглядзе схемы. Якому тыпу палітычнага рэжыму адпавядае такая сістэма кіравання?
5. Вызначце гістарычнае значэнне Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый. Які ўплыў гэтыя рэвалюцыі аказалі на ход еўрапейскай і сусветнай гісторыі?